Блізкая ўлада

# БЫЦЬ АДКРЫТЫМ У РАБОЦЕ З ЛЮДЗЬМІ

**Каля 30 чалавек з усіх куткоў Мінскай вобласці прыехалі на асабісты прыём да старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра ТУРЧЫНА.**

Жыхароў цэнтральнага рэгіёна хвалююць разнастайныя пытанні. Асноўны працэнт — праблемы ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва дарог, правядзенне ліній электраперадачы, якасць вады.

Людміла Алегаўна з горада Барысаў прыйшла на прыём да губернатара адразу з некалькімі тэмамі. Яна расказала, што дарога па завулку Матросава (дзе пражывае заяўніца) знаходзіцца ў нездавальняльным стане. «Раней там быў добры асфальт, які з часам прыйшоў у непрыдатнасць, — сцвярджае Людміла. — Але праблема яшчэ і ў тым, што па завулку Матросава знаходзіцца два вытворчыя прадпрыемствы: Нарыхтоўчая кантора па прыёме металалому, куды практычна кожны дзень прыязджае тэхніка забіраць сыравіну, і вытворчасць, куды круглыя суткі накіроўваюцца буйныя фуры. Вялікая колькасць грузавых машын і сапсавала дарогу».

Па словах заяўніцы, мясцовыя службы падсыпалі дарогу гравіем. Але завулак знаходзіцца на ўзвышшы, таму гравій з часам змыла дажджом. «Мы з 2012 года ваюем за сваю дарогу! Яе ўжо даўно трэба заасфальтаваць. Людзі зімой, восенню і вясной тонуць па калена ў гразі, а летам задыхаюцца ад пылу, — абураецца пенсіянерка. — Каб такіх праблем ізноў не ўзнікала, пункт прыёму сыравіны мэтазгодна перанесці ў іншую частку горада. Мы ж не толькі за дарогу перажываем. Мы за сваё жыццё баімся! А раптам гэты кавалак арматуры пры пагрузцы ўпадзе на галаву, калі будзем праходзіць міма? Ды і дзеці ўвесь час там ходзяць».

**Старшыня Барысаўскага райвыканкама Мікалай КАРПОВІЧ** адзначыў, што асфальтаванне завулка Матросава не плануецца. «Дарога падсыпаецца перыядычна гравіем. Асфальт мы людзям не абяцалі», — праінфармаваў ён.

Аднак заяўніца падала дакумент. У ім — адказ Барысаўскага райвыканкама ад 2013 года, дзе чорным па белым назначана: дарога па Матросава будзе заасфальтавана. «Вы ведаеце мае ўмовы. Абяцанне, дадзенае людзям, трэба выканаць у бягучым годзе», — распарадзіўся старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын.

Наступнае пытанне, якое хвалюе барысаўчанку, — вытворчыя памяшканні, куды заязджаюць габарытныя машыны. Яна просіць перанесці іх далей ад Матросава, бо з-за шуму не можа спаць па начах.

«У месяц на пункт прыёму сыравіны прыязджае ўсяго 2-3 машыны», — запэўніў Мікалай Карповіч. Аднак пенсіянерка з гэтым не пагадзілася. Па яе словах, туды кожны дзень заязджае па некалькі машын. Губернатар даручыў правесці маніторынг,



Фота БелТА.

каб мець дакладнае ўяўленне: колькі сапраўды машын заязджае на пункт прыёму другаснай сыравіны па вуліцы Матросава. «Калі там насамрэч ідзе шмат машын, трэба разглядзець пытанне пераносу нарыхтоўчага пункта, лічыць Аляксандр Турчын. — Але канчатковае рашэнне можна будзе прыняць толькі пасля месяца маніторынгу. І яшчэ раз нагадваю: самае галоўнае — адкрытасць у рабоце з людзьмі. Каб яны самі бачылі вынікі таго ж маніторынгу і потым у іх не ўзнікала пытанняў».

Трэцяя тэма, што хвалюе пенсіянерку, — вытворчыя памяшканні на месцы былога прадпрыемства. У пэўны момант індывідуальны прадпрымальнік з Оршы выкупіў іх. Цяпер, па словах заяўніцы, і днём, і ноччу туды прыязджаюць фуры, у якія вельмі шумна нешта загружаюць і выгружаюць. Як высветлілася, у гэтых памяшканнях ажыццяўляецца нарэзка плёнкі для нацяжных столяў.

«Трэба праверыць гэту вытворчасць: як яна працуе, на якіх падставах перайшла цяперашняму ўладальніку. І чаму працуе, па словах Людмілы Алегаўны, нават ноччу», — падагульніў губернатар.

Яшчэ адна барысаўчанка, якая з'явілася шматдзетнай маці, папрасіла садзейнічання ў выдзяленні яе сям'і зямельнага ўчастка пад будаўніцтва прыватнага дома. Раней сям'я ўжо атрымлівала ўчастак, аднак асвоіць не змагла. Па словах заяўніцы, з-за складанай жыццёвай сітуацыі яна была вымушана прадаць першы ўчастак. Цяпер жа, калі ў сям'і з'явілася магчымасць будаваць жыллё, у выдачы ўчастка для будаўніцтва адмаўляюць.

«Вы прадалі бясплатна атрыманы зямельны ўчастак, па законе дзяржава аказвае дапамогу адзін раз. Дзе гарантыя, што гісторыя не паўторыцца? — запытаў Аляксандр Турчын. — Хочаце пабудаваць жыллё — можаце набыць зямлю з аўкцыёну». У выніку губернатар Міншчыны даручыў кіраўніцтву раёна аказаць дапамогу ў падборы ўчастка, каб цана на яго была прымальнай для сям'і.

Жыхарку вёскі Шапавалы Валожынскага раёна таксама хвалюе дарожная тэма. Там, па вуліцы Цэнтральнай, патрабуецца асфальтаванне дзеля бяспечнага дарожнага руху. «Не скажу, што ёсць пытанні па дарожным пакрыцці. Праблема крыху ў іншым. Па дарозе вельмі інтэнсіўны транспартны рух. Хтосьці едзе праз Шапавалы ў вайсковую часць, многія накіроўваюцца на дачы. Калі ў звычайныя будні дзень па Цэнтральнай вуліцы праязджае 200—300 машын, то ў пятніцу, суботу і нядзелю — да 1000. Ад гэтага пыл невыносна страшны. Не можам ні ў двор выйсці, ні бялізну павесіць сушыцца. На агародзе няма сэнсу нешта вырошчваць: гародніна ж убярэ ўвесь гэты бруд і пыл ад машын», — расказала заяўніца.

Па словах жанчыны, яна неаднаразова звярталася ў розныя службы з просьбай заасфальтаваць дарогу. Ёй абяцалі, што асфальт пакладуць у 2022 годзе, на крайні выпадак — у 2023-м. Але ў выніку ўсё абмежавалася падсыпкай.

«Трэба ўчастак, які праходзіць па населеным пункце, заасфальтаваць, каб праблем з пылам больш не было. Гэта неабходна зрабіць у бягучым годзе. Тым больш што Валожын прымае абласныя «Дажынкі», — патрабаваў губернатар.

У Крупскім раёне паміж вёскамі Ухвала і Мікалаеўка размешчаны пешаходны мост. Яго актыўна эксплуатуюць, нягледзячы на наяўнасць аб'язной дарогі. Сёння мост прызнаны аварыйным. Заяўнікі звярнуліся ў мясцовыя органы ўлады, але ў рамонце ім адмовілі. Мостам мала хто карыстаецца, таму ў Крупскім райвыканкаме рамантаваць яго лічаць немэтазгодным. «Магчыма, мае сэнс узвесці драўляны мост. І калі кошт апынецца прымальны, то пытанне вырашыцца станоўча», — прапанаваў Аляксандр Турчын.

Жыхарка сталіцы жадае атрымаць участак пад жыллёвае будаўніцтва ў Бяларуцкім сельсканкаме Лагойскага раёна. Па словах заяўніцы, у гэтым раёне ёсць свабодныя ўчасткі. Больш за тое, сёння іх прадаюць на аўкцыёне. «Жыву з дзецьмі ў аднапакаёвай кватэры ў Мінску, знаходжуся ў чарзе і ў горадзе, аднак будаваць дом хачу за горадам, у такім месцы, каб было зручна дабірацца да працы і вучобы», — патлумачыла заяўніца.

Аляксандр Турчын даручыў разабрацца з продажам участкаў у Бяларуцкім сельсавеце, іх выкарыстаннем уласнікамі і мерамі, якія прымаюцца. «Мінскі і Лагойскі раёны вельмі запатрабаваныя. Набыць участкі ў іх магчыма толькі з аўкцыёну», — разам з тым паведаміў старшыня Мінскага аблвыканкама. Аляксандр Турчын параіў заяўніцы разгледзець для атрымання ўчастка іншы раён.

Асабісты прыём грамадзян у губернатара працягваўся цэлы дзень. Акрамя вышэйпералічаных праблем, да яго звярталіся з пытаннямі аб пагрозе падтаплення падвальнага памяшкання ў жылым доме, аб адсутнасці электразабеспячэння, аб будаўніцтве новых інжынерных сетак, наконт зямельных спрэчак і іншага. Губернатар уважліва выслухаў кожнага, усе агучаныя пытанні ўзяты ім пад асабісты кантроль.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ЧЫМ ЗДЗІВІЦЬ «БЕЛАГРА-2024»?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У рамках дзелавой праграмы выставы пройдзе каля 20 тэматычных семінараў і канферэнцый, на якіх будуць абмяркоўвацца забеспячэнне канкурэнтаздольнай прадукцыяй, племянная жывёлагадоўля, раслінаводства, машынабудаванне, аграрная адукацыя, перспектывы супрацоўніцтва з краінамі блізкага і далёкага замежжа, удакладніў намеснік міністра.

## Гандлёвыя пляцоўкі і конкурсы

На выставе будуць працаваць кірмашы-продажы, розныя гандлёвыя пляцоўкі. Пройдуць конкурсы на найлепшую племянную малочную карову, «Найлепшы араты», «Чэмпіён смаку», дэманстрацыйныя паказы племянных жывёл і сельскагаспадарчай тэхнікі. Традыцыйна на галоўнай сцэне адбудуцца выступленні творчых калектываў. Таксама гледачоў чакае праграма, падрыхтаваная Рэспубліканскім цэнтрам алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі, на асобнай пляцоўцы кожны ахвотны зможа кіраваць тэхнікай МТЗ.

«Навінкай выставы стане «Партызанская паляна», арганізаваная Міністэрствам абароны. Думаю, што кожны наведвальнік знойдзе для сябе нешта цікавае», — адзначыў Уладзімір Гракун. Намеснік міністра падкрэсліў, што «БЕЛАГРА» стане карысным і для тых, хто вядзе прысядзібную гаспадарку. На выставе будзе прадстаўлены шырокі спектр насення, парод хатніх жывёл, тэхналогіі апрацоўкі глебы і многае іншае, здольнае выклікаць цікавасць у сельскіх жыхароў.

## Баклажан не будзе рэдкасцю

Спікер адзначыў, што беларускія цяплічныя прадпрыемствы будуць развіваць вытворчасць грунтавой агароднiны. Экспазіцыя плодаагароднiннай прадукцыі на выставе «БЕЛАГРА-2024» будзе прадстаўлена 12 прадпрыемствамі. Яны прадставяць сваю прадукцыю, вырашчаную ў ахаваным грунце.

«Гэта сёння новы кірунак. Мы поўнасцю забяспечылі наша насельніцтва агуркамі. Наступная задача — забяспечыць таматамі, а ў далейшым — баклажанамі, перцам і зялёнымі культурамі. У экспазіцыі можна будзе азнаёміцца з работай цяплічных камбінатаў, ацаніць і набыць іх прадукцыю», — адзначыў намеснік міністра. Уладзімір Гракун удакладніў, што ва ўсе дні дзейнасці выставы «БЕЛАГРА-2024» будзе арганізаваны кірмаш-продаж прадуктаў харчавання па даступных цэнах.

Нагадаем, што выстава «БЕЛАГРА-2024» пройдзе ў выставачным цэнтры Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі Камень». Уваход бясплатны. У дні выставы ў Мінску са станцыі «Партызанская» будзе курсіраваць спецыяльны транспарт.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Экс-прэм'еру Тайланда прад'яўлена абвінавачанне па справе аб абразе манархіі



Генеральная пракуратура Тайланда прад'явіла абвінавачанне былому прэм'ер-міністру Таксіну Чынавату па артыкуле аб абразе манархіі, які прадугледжвае турэмнае зняволенне на тэрмін ад 3 да 15 гадоў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал Thai PBS. Чакаецца, што справа будзе перададзена ў суд 18 чэрвеня, паколькі Чынават запытаў адтэрміноўку яго разгляду ў сувязі з заражэннем COVID-19. Па меркаванні боку абвінавачання, Чынават зняслаўў манархію ў каментарыях, зробленых у Сеуле ў маі 2015 года. У інтэрв'ю газеце «Часон ільба» ён заявіў, што члены Таемнага савета (дарадчага органа пры каралі Тайланда) падтрымалі дзяржаўны пераварот 22 мая 2014 года, у выніку якога быў зрынуты ўрад на чале з яго малодшай сястрой Інглак Чынават.

## Вялікабрытанія сутыкнулася з самай складанай фінансавай праблемай за 70 гадоў

Наступнаму ўраду Вялікабрытаніі трэба будзе вырашыць найскладанейшую праблему з напаўненнем дзяржаўнага бюджэту, паведаміла агенцтва Bloomberg. «Задача, якая стаіць перад пераможцам на выбарах, больш сур'ёзная, чым тыя, з якімі сутыкаліся ўрады з 1950-х гадоў. Незалежна ад таго, хто пераможа, яго чакаюць высокія даўгі, высокія працэнтныя стаўкі і нізкія тэмпы росту», — адзначыла агенцтва. На думку Інстытута фіскальных даследаванняў (IFS), для напаўнення бюджэту новаму ўраду давядзецца або скарачаць выдаткі на дзяржаўныя паслугі, што будзе балюча, або павысіць падаткі, якія ўжо блізкія да 80-гадовага максімуму. Альтэрнатывай можа быць павелічэнне запазычанняў, што ўскладніць стабілізацыю ўзроўню дзярждоўгу.

## Амерыканскую падлодку часоў Другой сусветнай знайшлі на дне Паўднёва-Кітайскага мора

Амерыканскую падводную лодку USS Harder часоў Другой сусветнай вайны знайшлі на дне Паўднёва-Кітайскага мора. Аб знаходцы паведаміла ТАСС са спасылкай на партал Business Insider. Паводле дадзеных крыніцы, судна захавалася дастаткова добра. Не абышлося і без разбурэнняў, аднак яны закранулі толькі баявую рубку карабля. Як устаноўлена, падводная лодка з 79 вайскоўцамі на борце затанула 24 жніўня 1944 года. Дакладна вызначыць назву падлодкі дапамаглі даныя арганізацыі Lost 52. Яна займаецца пошукам 52 амерыканскіх падлодак, затанулых у той перыяд, піша Business Insider.

Кніжны свет

# БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА ЯДНАЕ

**Ва Уфе (Рэспубліка Башкартастан) на пляцоўцы ІІ Міжнароднага кніжнага кірмашу «КІТАП-БАЙРАМ» прайшла прэзентацыя толькі што выдадзенай «Анталогіі сучаснай беларускай літаратуры». Выданне пабачыла свет у серыі «Паліца Садружнасці».**

На конкурсе «Кніга года на Зямлі Урал-Батыра» за гэты анталагічны зборнік Башкірскае выдавецтва «Кітап» імя Зайнаб Біішавай атрымала першы прыз у намінацыі «Выданне, якое робіць унёсак у дыялог культур».

Ініцыятар стварэння анталогіі твораў беларускіх паэтаў і празаікаў — старшыня Саюза пісьменнікаў Башкартастана вядомы празаік Айгіз Баймухаметаў. Ён двойчы прыязджаў у Беларусь, збіраў творы, якія павінны былі ўвайсці ў калектыўную кнігу, раіўся з беларускімі калегамі. Укладальнікам выступіла празаік Танзіля Даўлетбердзіна.

Удзельнічалі ў прэзентацыі і госці з Беларусі. Сярод іх — старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяна Дземідовіч. На сустрэчы на кніжным кірмашы ішла размова і пра тое, што ў найбліжэйшы час у Мінску пабачыць свет анталогія сучаснай башкірскай літаратуры ў перакладзе на беларускую мову. Дадзеныя праекты нараджаюцца ў выніку дзеяння Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж пісьменніцкімі арганізацыямі Беларусі і Башкартастана, якое было заключана на папярэднім кніжным кірмашы «Кітап-Байрам» у 2023 годзе.

**Мацвей ПАШКОЎСКІ.**